2. ***Мельнікава З.П.*** Ля вытокаў лірызму новай беларускай літаратуры // Весці АН БССР: Сер. грам. навук, 1985. № 4. С. 94-99.
3. ***Колас Я.*** Збор твораў у 14-ці тамах. Т. 9. Трылогія «На ростанях». Мн., 1975. – 800 с.
4. ***Гегель Г.В.Ф.*** Эстетика. В 4 т. Т. 3. М., 1971. – 624 с.
5. ***Пшыркоў Ю.С.*** Летапісец свайго народа: Жыццёвы і творчы шлях Якуба Коласа. Мінск, 1982. – 367 с.
6. ***Навуменка І.Я.*** Якуб Колас: Духоўны воблік героя. Мінск, 1981. – 240 с.

*S U M M A R Y*

*The article investigates the specific character of the trilogy genre as an independendant artistic system in Yakub Kolas' works and substantiates the place and role of this genre in the making of the writer's artistic individuality. The article defines the ways which led Kolas the level of artistic harmony observed in the trilogy «Na Rosstaniakh», analyses the methods of laying fundamentals and conditions of epos in the trilogy genre, defines the role of psychologism in this process.*

*Поступила в редакцию 28.11.2001*

УДК 882.6

**В.Ф. Падстаўленка**

# Панарама сатырычных вобразаў у апавяданнях А. Мрыя

Андрэй Мрый вядомы шырокай грамадскасці больш як аўтар сатырычнага рамана «Запіскі Самсона Самасуя»(1929). Але дайшлі да нашага часу і іншыя творы: апавяданні ранняга і «узвышэнскага» перыяду творчасці, шматлікія мастацка-публіцыстычныя артыкулы. Вядома, што ў апошнія гады жыцця А. Мрыем былі напісаны другія празаічныя творы, у прыватнасці, раман «Жывы дом», але дагэтуль яны так і не знойдзены. Даследаванне творчасці празаіка было распачата толькі ў апошні час, і дзякуючы намаганням літаратуразнаўцаў (І. Чыгрына, Д. Бугаева, Я. Лецкі, З. Драздовай, П. Васючэнкі) творчасць пісьменніка была «рэабілітавана». Пісьменніцкая спадчына А. Мрыя патрабуе дэталёвага аналізу, што і падштурхнула да напісання гэтага артыкула, мэтай якога стала «сучаснае» прачытанне апавядальнага эпасу А. Мрыя, у прыватнасці, аналіз сатырычных вобразаў-тыпаў у малой прозе пісьменніка.

Аб'ектывізм пры адлюстраванні быцця, уласцівы аўтарскай манеры пісьменніка-сатырыка, быў рэалізаваны ім у працэсе напісання празаічных твораў, якія ахоплівалі разнапланавы спектр праблем. Глабальна-філасофскі сэнс апавяданняў быў дапоўнены аналізам многіх аспектаў грамадска-палітычнага і сацыяльна-асобаснага характару. Так, абразок «На кірмашы» перадае занепакоенасць аўтара парадаксальнасцю існавання і прыматам матэрыяльнага, фізічнага над ментальным пачаткам у чалавеку. У сатырычна-драматычным плане раскрываецца праблема псеўдадухоўнасці ў творы «Рабін». Апавяданні «Камандзір», «Няпросты чалавек», «Гармонія ў ружовым» адлюстроўваюць маральную мізэрнасць пэўных людзей на сумежжы дзвюх эпох. Канфлікт старога свету і новых законаў ляжыць у аснове твораў «Калектыў Яўмена», «Пятрок», «Але, Алена». Бюракратызм, неразумнасць

чыноўнікаў, іх нацыянальна-культурны нігілізм з'яўляецца аб'ектам высмейвання ў празаічных творах «Тварам да вескі», «Абстрыкаўся», «Прафесар акультных навук», «Цар Максімільян» у весцы». З улікам тагачасных ідэалагічных догмаў відавочны той факт, што творы А. Мрыя былі небяспечнымі для аўтара: іх спрошчана-вульгарызатарская трактоўка прывяла да абвінавачвання пісьменніка ў антысавецкіх настроях. (Гэты момант падрабязна разглядаўся вядомым літаратуразнаўцам Д. Бугаевым у адным з артыкулаў з цыкла «Дасягнутае і страчанае») [1].

Панарама сатырычных вобразаў у апавяданнях А. Мрыя вызначаецца тыповасцю, унутранай супярэчнасцю і вонкавым каларытам. У гэтай сувязі выклікае цікавасць твор «На кірмашы», які складаецца з трох замалёвак-абразкоў. Сюжэтна яны нагадваюць сцэнкі з батлеечнага спектакля з яркімі персанажамі і народным гумарам. У першым абразку «Астраханскія селядцы» намаляваны цікавейшы вобраз гандляркі, пры стварэнні якога аўтар спыняецца толькі на самых вызначальных рысах: «Валоссе ўскудлычана, дзесяты пот зганяе. Так і напісана на яе твары: грошы, грошы, грошыкі» [2]. Вобраз гандляркі – гэта тыповы вобраз сквапнага, але душэўна абмежаванага чалавека. Думка аб небяспецы поўнай страты грамадствам сапраўдных каштоўнасцей развіваецца далей, на прыкладзе вобраза багамаза, для якога вера, рэлігійныя святыні сталі будзёным таварам. Паказваючы наколькі моцна змяніліся каштоўнасныя арыенціры, пісьменнік адзначае, што «сусветны карнавал» з перавёрнутымі палюсамі дабра і зла пачынае насіць неабмежаваны характар: «Плошчы, вуліцы, завулкі запоўнены народам... Пальца нельга было праціснуць...» [2, с. 163]. Смех у творы носіць «амбівалентны» (М. Бахцін) характар і накіраваны на кожнага ўдзельніка «сусветнага блазнерства»[ 3].

Часам асобныя эпічныя творы А. Мрыя нагадваюць публіцыстычныя допісы. Гэта ўласціва і апавяданню «з натуры» «Цар Максіміліян» у вёсцы». Пачатак твора выразна публіцыстычны: «Можна заўважыць, якія вялікія перспектывы адчыніліся перад геніем народу, які скінуў кайданы!» [2, с.167]. Нягледзячы на ідэалагічную пафаснасць апавядання, твор з'яўляецца востра праблемным, бо прысвечаны распаўсюджванню палітыкі беларусізацыі ў краіне. Мрый разумеў неабходнасць беларусізацыі і культурнай рэвалюцыі, толькі пісьменнік папярэджваў, што трэба мець тонкі густ і падрыхтаванасць, каб не застацца на ўзроўні батлеечных інтэрпрыз. У апавяданні прасочваецца своеасаблівая эвалюцыя смеху. С пачатку твора смех носіць легкі, іранічны характар, але паступова, калі страсці вакол спектаклю распаліліся, смех набывае з'едлівыя, выкрывальныя рысы, а ў эпізодзе фіналу імпрэзы-шаржыраваныя, карыкатурныя адценні. Эвалюцыя элементаў камізму адыгрывае тут выключную ролю, бо «смех змагаецца з дыдактыкай, пранікае ў табуіраваныя зоны жыцця, надае апавяданню шматмернасць» [4]. Аб'ектамі сатырычнай крытыкі тут выступаюць прыхільнікі прымітыўна-спрошчанага разумення нацыянальна-культурнага развіцця краіны і «народныя масы», што сваё спрадвечна-спадчыннае губляюць у мітуслівым коле гісторыі.

Рэалістычныя тэндэнцыі пры паказе жыцця, выяўленыя ў папярэдніх творах, значна развіліся ў далейшай прозе пісьменніка. Так, апавяданне «Прафесар акультных навук» мае падзагаловак «З хронікі павятовага гораду К.», што прэтэндуе на праўдзівасць зафіксаваных аўтарам падзей. У цэнтры апавядання – гісторыя прыгод псеўдапрафесара Джэпкінга, класічнага ўзора махляра і прайдзісвета. Пасля аналізу сюжэта твора становіцца зразумела, што за знешне займальнай абалонкай апавядання схавана сатырычна завостраная карціна існавання абывацельскага асяродка, які сам, фактычна, парадзіў такіх псеўдапрафесараў. Пры стварэнні партрэта галоўнага героя

праяўляецца талент майстра сатырычнай дэталі, пры гэтым аўтар удала спалучае кантраст неадпаведнасці паміж уяўнай самавітасцю Джэпкінга і яго знешнасцю камедыянта: «з дзвярэй вагону важна выйшаў чалавек у чырвоным аксамітным фрэнчы... ўбачылі дужа доўгі, як у бусла, нос, рабы твар (як быццам ноччу на ім гарох малацілі) і ... зямнога калеру кепку на галаве» [2, с.171]. Вобраз Джэпкінга выступае ў апавяданні сімвалічным «каталізатарам» выкрыцця негатыўных момантаў у абывацельскім свеце, дзе пануюць абсурдна-фармальныя законы і разумовая абмежаванасць насельніцтва.

Значная частка апавяданняў пісьменніка прысвечана вечнай тэме адносін бацькоў і дзяцей, сутыкнення новага свету са старым: «Пятрок», «Але, Алена!», «Калектыў Яўмена», «Няпросты чалавек». У апавяданні «Калектыў Яўмена» пісьменнік вуснамі старой жанчыны Домны Лямцюговай выказвае думкі старэйшага пакалення адносна новых парадкаў: «Сама не ведаю, ці я жыву, ці мяне ліхаманка калоціць. Усе па-новаму, па-новаму...» [2, с.234]. А. Мрый умее добра падмеціць недахопы як старога, так і новага ўкладу жыцця. Маці Яўмена не падабаецца вялікая хата з шырокімі вокнамі, бо ей здаецца, нібы хтосьці ў вокны глядзіць. Не разумее яна «новыя, перакручаныя словы». Сваякі лічаць, што «Яўмен захварэў на панства!» [2, с. 237]. Пісьменнік падкрэслівае, што і жаданне маладога пакалення змяніць усё набывае анекдатычныя рысы. Яўмен дае новыя мянушкі жывёле (Дзянікін, Анпяратрыца і Антанта), адпаведна і сынка называе – Акіянчык. Марыць пра новы ўклад у весцы, а ў самога «блох ліха ведае колькі». Трэба адзначыць, што крытыкі, у прыватнасці, Яўген Лецка лічыў, што «да твораў гумарыстычных, а тым больш сатырычных «Калектыў Яўмена» можна аднесці з вялікай нацяжкай» [2, с. 14]. Нам думаецца, што такое сцвярджэнне не зусім справядліва. Апавяданне насычана гумарыстычнымі замалеўкамі і сатырычнымі апісаннямі, гратэскнае спалучэнне драматычнага і камічнага таксама відавочнае. Сам прыём аповяду старой пра новыя парадкі выклікае шмат смеху. Да таго ж мова герояў, багатая на каламбуры, алагізмы і фраземы, надае дадатковую гумарыстычнасць.

Адносна літаратурнага працэсу 20-30-х гадоў цікавае даследаванне правёў Л.Ф. Яршоў, які адзначаў, што ў гэты час «быў характэрны пераход ад плакатнасці і маскавасці адмоўных герояў да больш высокага тыпу рэалістычнай умоўнасці» [5]. Гэтыя тэндэнцыі знайшлі адбітак у творчасці Мрыя, што, прынамсі, заўважаецца ў апавяданні «Рабін» на вобразе Мардуховіча, які лічыцца лепшым здабыткам апавядальніка. Як адзначаюць даследчыкі, адным з характэрных элементаў стылю А. Мрыя было тое, што пісьменнік «падкрэсліваў унутраную нестатычнасць герояў, непрадказальнасць іх паводзін» [6]. Твор, апрача філасофскай заглыбленасці, дынамізму камічна-драматычных эпізодаў і каларытнага персанажа, мае спецыфічную жанравую пабудову (апавяданне вядзецца ў выглядзе маналогу і набліжаецца да сказавай формы).

Са зменай грамадскай супольнасці відазмяняюцца і яго складаючыя. Рабін Мардуховіч стаў звычайным агітатарам, далекім ад ісцінай веры, ён заклапочаны матэрыяльнымі выгодамі і «асабістымі» прыгодамі. Паэтапна раскрываючыся, вобраз Рабіна ў фінале апавядання выступае цалкам адмоўна. У якасці сродкаў камічнага выкрыцця празаікам ужываецца прыём самараскрыцця персанажа. Гэта акалічнасць стала дзейным элементам псіхалагізацыі твораў пісьменніка. З мэтай падагульнення найбольш істотных мастацкіх асаблівасцей апавяданняў А. Мрыя, можна вылучыць наступнае:

– ідэйна-тэматычна творы вельмі багатыя;

– асноўныя вобразы апавяданняў не з'яўляюцца шаблоннымі, і вузка трактаваць іх лічылася б памылковым;

– у творах адчуваецца тэндэнцыя да нарастання псіхалагізму;

– праблематыка апавяданняў не вычэрпваецца колам пытанняў, узнікшых у паслярэвалюцыйны час, а мае пазачасавую сувязь з «вечнымі пытаннямі» літаратуры;

– адбываецца паступовы пераход ад публіцыстычнасці да мастацкасці і рэалізму;

– многія тэндэнцыі апавяданняў А. Мрыя паступова выявіліся і развіліся ў рамане «Запіскі Самсона Самасуя».

## ЛІТАРАТУРА


1. ***Бугаёў Д.*** Дасягнутае і страчанае. Жанрава-стылёвыя тэндэнцыі ў развіцці беларускай літаратуры XX стагоддзя (20-30-я гады). Сатырычная проза. Андрэй Мрый // Полымя, 1993, №12. С.236.
2. ***Мрый А.*** Творы. Мн., 1993. – 258 с.
3. ***Бахтин М.*** Творчество Франсуа Рабле и народная культура средневековья и Ренессанса. М., 1990. С.17.
4. ***Трагедыя пісьменніцкага лёсу***. Творчая постаць Андрэя Мрыя // Полымя, 2000, №5. С.260.
5. ***Ершов Л.Ф.*** Сатирические жанры русской советской литературы (от эпиграммы до романа). Л., 1977. С.127.
6. ***Драздова З.У.*** Творчасць Андрэя Мрыя і Лукаша Калюгі: Стылявыя асаблівасці. Мн.,1997. С.78.



## S U M M A R Y

*The object of the article is the system of satirical images in the stories by the Belarusian writer Andrei Mryi. The aim of this paper is to present the basic ideas of the theory of the nature of laugh in the literary works of this author. This article may be said to be an attempt of a modern look at the stories by Andrei Mrui.*



*Поступила в редакцию 11.01.2002*